# Мясцовыя выбары 1990 году

Выбары 1990 году як бы знаходзяцца на мяжы часоў: яны адбыліся ў савецкую эпоху, але вызначальна паўплывалі на эпоху сёньняшнюю. Гэта былі апошнія выбары, якія праводзіліся ў БССР, аднак дэпутаты, абраныя на гэтых выбарах, сталі першымі дэпутатамі мясцовых Радаў незалежнай Беларусі. Іх вынікі вызначылі форму мясцовай улады ў краіне. Акурат на легісьлятуру дэпутатаў мясцовых Радаў 1990 году абраньня выпаў найбольш актыўны пэрыяд фармаваньня і разьвіцьця мясцовай улады. Выбары 1990 году можна назваць выбарамі нумар нуль. Гэта яшчэ ня першыя выбары незалежнай Беларусі, але якраз зь іх пачынаецца гісторыя мясцовых выбараў. На іх абралі першыя мясцовыя Рады, пракамуністычныя ў сваім складзе. У выніку мясцовая ўлада сустрэла абвяшчэньне незалежнасьці, калі 67,4% ад агульнай колькасьці «мясцовых» дэпутатаў складалі сябры КПСС і УЛКСМ. Найбольш камуністаў і камсамольцаў было ў абласных Радах.

Традыцыі палітычнага прадстаўніцтва пачалі фармавацца з наступных выбараў — 1995 году.

*Пётра Натчык*